ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 14(1207)
ЧАЦВЕР,
15 верасня
2011 г.
*Выходзіць два разы ў месяц*
*Цана дагаворная*

# Гомельскі ўніверсітэт



*Газета заснавана ў верасні 1969 года*

## У РЭЧЫШЧЫ НОВЫХ РЭАЛІЙ

**Гомельшчыну з рабочым візітам упершыню наведаў міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь С.А. Маскевіч. У актавай зале нашага ўніверсітэта адбылася яго сустрэча з рэктарамі і членамі саветаў гомельскіх вну.**



На пачатку свайго выступлення Сяргей Аляксандравіч адзначыў, што вельмі рады знаходзіцца ў ГДУ імя Ф. Скарыны, які мае багатую цікавую гісторыю, выдатныя традыцыі, вядомыя навуковыя школы. Яскравым таму пацвярджэннем з'явіліся шматлікія экспанаты выставы аб дасягненнях калектыву вядучай вну рэгіёна ў вучэбнай, навукова-даследчай, выхаваўчай дзейнасці, спорце, разгорнутай у фае актавай залы, і з якой міністр уважліва азнаёміўся.

С.А. Маскевіч засяродзіў увагу аўдыторыі на тых знакавых падзеях, якія адбыліся апошнім часам у сістэме адукацыі краіны (з 1 верасня 2011 г. уступіў у сілу Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі), абазначыў асноўныя напрамкі практычнай работы вучоных, выкладчыкаў вну, якая іх чакае па рэарганізацыі вышэйшай школы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

***Музей-лабараторыя Ф. Скарыны запрашае студэнтаў і выкладчыкаў усіх факультэтаў, асабліва першакурснікаў, наведаць цікавую і багатую выставу кніг з аўтографамі, якая адкрыецца ў панядзелак, 21 верасня 2011 г. ў памяшканні 1-7 вучэбнага корпуса №4.***

Посвящение в студенты

## С МУДРЫМИ НАПУСТВИЯМИ

***Яркими лучами солнца, отражающими свой теплый свет в едва тронутой желтизной листве, встретило первое осеннее утро всех тех, кто спешил на Праздник знаний. По-настоящему солнечное настроение царило и в среде новоиспеченных первокурсников нашего университета, которые собрались на площадке перед учебным корпусом №1 на первую в своей жизни студенческую линейку. Радостное возбуждение, приятное волнение, счастливые улыбки на лицах молодых людей – все говорило о том, насколько важен для них этот торжественный момент символического посвящения в студенты, вслед за которым вуз гостеприимно распахнет для них свои двери, громким звонком оповещая о начале первой студенческой лекции.***




По традиции для приветствия первокурсников на праздничной линейке собрались представители ректората университета, общественных организаций, преподаватели и, что стало приятным сюрпризом для юношей и девушек, их непосредственные руководители – деканы двенадцати факультетов ГГУ, облаченные в торжественные академические мантии. В скором времени в их лице молодые люди обретут настоящих наставников и помощников, при их непосредственном участии смогут приобщиться к славной истории университета.



А пока этого еще не произошло, первокурсники с неподдельным интересом и вниманием воспринимали рассказ ведущих Дня знаний о богатом прошлом ГГУ им. Ф. Скорины, его выдающихся достижениях, широко известных научных школах, разносторонних международных программах, прославленных деятелях науки, культуры, спорта, чьи судьбы так или иначе были связаны с университетом. Гордо звучали имена тех ученых, благодаря которым ГГУ сегодня по праву считается ведущим вузом Гомельского региона. Отдавая дань памяти и глубочайшего уважения этим великим людям, студенты возложили цветы к мемориальным доскам д.ф.н., профессора В.В. Аниченко, д.п.н., профессора М.А. Дмитриева, д.п.н., профессора И.Ф. Харламова, тем самым дав символический обет достойно продолжать начатое ими дело, проявлять себя в учебе и стремиться стать гармоничными личностями.



Об этом, обращаясь с приветственным словом к первокурсникам, говорил и ректор университета А.В. Рогачев. «Помните о том, что студенческая жизнь – это не только веселье и беззаботность, прежде всего это кропотливый напряженный труд, нелегкий путь к самосовершенствованию, личностному росту, истинному профессионализму, – отметил Александр Владимирович. – На вас, будущее нашей страны, мы возлагаем сегодня большие надежды, а потому не жалеем ни времени, ни сил для того, чтобы дать вам возможность смело заявить о себе, создаем все условия для вашего продвижения вперед». Свои искренние поздравления и напутствия в адрес юношей и девушек ректор подкрепил вручением им символического студенческого билета, который по традиции является знаком доверия к первокурсникам и дарует им право с гордостью называть себя студентами ГГУ.

Немало теплых слов и добрых пожеланий услышали молодые люди и от члена-корреспондента НАН Беларуси, д.ф.-м.н., профессора А.Н. Сердюкова. Он поделился своими воспоминаниями о том знаменательном дне, когда сам впервые переступил порог нашего вуза, с которым, к счастью, ему не пришлось расставаться. За 50 лет, прошедших с того волнительного момента, Анатолий Николаевич ни разу не пожалел о сделанном выборе, чего от всего сердца пожелал и нынешним первокурсникам, которые своим упорством и трудом могут добиться огромных успехов, стать настоящими профессионалами и яркими личностями.

Свои искренние поздравления собравшимся преподнесла и д.ф.н., профессор А.А. Станкевич. «Вас ждут неповторимые годы студенческой жизни, полные новых знакомств, интересных открытий, неожиданных находок, – отметила Александра Александровна. – Вы, юные и инициативные, воплощаете новое прогрессивное поколение рационализаторов, за вами – наше завтра. Желаю вам мудрости и терпения, отличных знаний и удачи в поисках собственного пути к истинной гармонии».

Одним из самых ярких моментов праздника стала подготовленная студенческим клубом ГГУ инсценированная театральная зарисовка «Скорина – потомкам», выдержанная в стиле глубокой древности. Из уст великого белорусского просветителя и первопечатника эпохи Возрождения Ф. Скорины, чье прославленное имя наш университет с гордостью носит уже на протяжении 23 лет, прозвучали мудрые напутствия первокурсникам «…учитися музыки, умети арифметику, знати наука всякое…». В бесценной книге «Библии», которую представили студентам усердные ученики просветителя «…ест справедливость, чистота душевная, правда о вере, любви, надежди…», и чтобы раскрыть истину, молодой смене студенчества предстоит активно и неустанно постигать тонкости наук, зреть в корень проблем, искать и находить ответы на вопросы.

Отныне эта ответственная миссия возлагается именно на них, так как начинать движение вперед нужно без промедления, с самых истоков, с самого начала своего студенческого пути. Эту мысль в своем приветственном слове к «новобранцам» подчеркнул обладатель премии специального фонда Президента республики по социальной поддержке талантливой молодежи пятикурсник математического факультета Владимир Васильев. От имени всех студентов нашего вуза он дал первокурсникам ценные советы: не оставаться незаметными, быть активными и инициативными, проявлять себя в разных сферах жизни! Только в этом случае студенческая жизнь станет по-настоящему незабываемой и насыщенной.

***«Студенческая жизнь – прежде всего кропотливый напряженный труд, нелегкий путь к самосовершенствованию, личностному росту, истинному профессионализму».***

В знак своего согласия претворять в реальность эти мудрые напутствия выпускников первокурсник экономфака Александр Михайлов принял из рук Владимира символический ключ знаний и публично пообещал, что молодые люди, которые сегодня впервые переступят порог ГГУ уже в новом качестве, станут достойными студентами университета, будут способствовать его процветанию, беречь и приумножать его славные традиции. Торжественность момента поддержал прозвучавший на линейке студенческий гимн «Гаудеамус». А чудесным завершением праздника стал легкий завораживающий вальс, который подарили присутствующим участники народного фольклорно-хореографического ансамбля «Радимичи».




**С. ХОЗЕЙ.**
**Фото В. Чистика.**

## ПЕРВОКЛАШЕК ПОДДЕРЖАЛ ПРОФСОЮЗ

Подготовка первоклассника к школе, покупка всего необходимого для учебных занятий требует в наше время немалых денежных затрат. Материальную помощь преподавателям и сотрудникам, дети которых в этом году пошли в первый класс, оказал профком нашего университета, выделив из профсоюзного бюджета по 100 тыс. руб. на ребенка для покупки ранцев и школьных принадлежностей. Поддержала своих членов и областная организация профсоюза работников образования и науки. На расчетный счет профкома ГГУ перечислено по 50 тыс.руб. на каждого из 23 новоиспеченных школьников.

## ХРОНІКА

**Загадам па ўніверсітэту на пасаду загадчыка кафедры падрыхтоўкі да паступлення ў вну і прафарыентацыі назначана дацэнт ЧАЙКОВА Святлана Віктараўна.**

***

**Службу аховы і бяспекі ўніверсітэта ўзначаліў СІВЕНКА Мікалай Сцяпанавіч.**

# У РЭЧЫШЧЫ НОВЫХ РЭАЛІЙ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Сяргей Аляксандравіч падкрэсліў, што сітуацыя з вышэйшай адукацыяй даволі стабільная, захоўваецца асноўныя навуковыя накірункі вышэйшай школы, а дух універсітэта з'явіўся нават там, дзе раней яго не было. Сёння ўсё больш жадаючых атрымаць



вышэйшую адукацыю, і "няма заганы ў тым, калі чалавек яе атрымае і свядома ідзе працаваць, але лепш, калі дадзены працэс адбываецца ў адваротным парадку: спачатку праца, а пасля толькі – дыплом".

Дэмаграфічная сітуацыя ўносіць свае карэктывы – колькасць абітурыентаў у рэспубліцы скарачаецца, таму неабходна дакладна вызначыць больш запатрабаваныя спецыяльнасці, усё ўзважыць і знайсці баланс інтарэсаў асобна ўзятай вну і рэгіёна, вну і ўсёй сістэмы адукацыі, адзначыў міністр. Агульнаадукацыйныя праграмы павінны стаць практыкаарыентаванымі.

Адпавядаць рэаліям дня – такі арыенцір дзейнасці павінен стаць вызначальным у рабоце вышэйшых навучальных устаноў. Пры гэтым падкрэслівалася, што пры неабходнасці змяншэння колькасці гадзін асобных вучэбных курсаў, нагрузкі выкладчыкаў не варта скарачаць навуковыя калектывы, навуковыя школы. Ставіцца задача павышэння прэстыжу магістратуры, каб таленавітая моладзь ішла ў навуку, мела магчымасць праходзіць сур'ёзную стажыроўку ў лепшых цэнтрах свету, рэалізоўвалася праграма па падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

Актуальным застаецца пытанне ўдасканалення вучэбна-лабараторнай базы вну. Тут пакуль праблем яшчэ шмат. Але яны будуць вырашацца: урадам краіны запланавана выдзяленне буйных асігнаванняў на яе развіццё, сацыяльныя патрэбы.

Сустрэча завяршылася дыялогам: міністр адказаў на зададзеныя з залы пытанні, якія на сённяшні дзень асабліва хвалююць вучоных Гомельшчыны.

Шаноўны госць падзякаваў удзельнікам сустрэчы за іх кампетэнтнасць, неабыякавасць і выказаў упэўненасць, што толькі разам магчыма справіцца з праблемамі, а самае галоўнае – выйсці на новыя, цікавыя і ініцыятыўныя справы.

**М. МАРКЕВІЧ,**
**магістрант кафедры беларускай мовы.**
**Фота У. Чысціка.**

Дата

# СОХРАНИТЬ И ПРИУМНОЖИТЬ ДОСТИГНУТОЕ

**10 лет назад на факультете психологии и довузовской подготовки была открыта кафедра социальной и педагогической психологии. Это событие стало очень важным как для факультета, так и для университета в целом. И сложно, и приятно подводить итоги ее плодотворной деятельности. Сложно – потому что сделано очень много, и приятно, потому что результаты этой работы не оставались незамеченными как на республиканском, так и на международном уровнях.**

Кафедра начиналась с энтузиазма, идеи, которой горел факультет психологии и довузовской подготовки. И, наверное, как и любое дело, в которое вложено столько любви и старания, была обречена на успех.

Все эти годы кафедру возглавляла к.п.н., доцент, действительный член профессиональной психотерапевтической лиги России Г.В. Гатальская. Галина Викторовна явилась инициатором, идейным вдохновителем и руководителем множества проектов. Благодаря ее энергии, инициативе, не одно поколение студентов имело возможность получить бесценный опыт практической работы, поучаствовать в международных стажировках, конференциях, проводимых на кафедре мероприятиях, реализуемых волонтерских проектах и в итоге развиваться в профессиональном и личностном плане.

> **Елена СТАЛЬЧЕНКО, создатель творческих проектов, выпускница 2005 года:** ***«Кафедра – это прежде всего люди. Преподаватели, которые умело вели и направляли и, безусловно, друзья, которые со временем стали частью души».***

За 10 лет сотрудниками было реализовано множество крупных исследовательских проектов по наиболее актуальным темам, носящим теоретическую и практическую значимость.

Ориентация на сближение образовательных систем Запада со странами Центральной и Восточной Европы, реализуемая в рамках Болонского процесса, – общереспубликанская цель. Поэтому предметом особой гордости кафедры является сотрудничество с лабораторией психологии здоровья факультета психологии Флорентийского университета, итальянскими ассоциациями ANPAS, LEGAMBIENTE и др. Профессор Сауло Сиригатти, долгое время возглавлявший факультет психологии университета Флоренции, один из крупнейших итальянских специалистов в области клинической психологии и психологии здоровья, стал почетным профессором ГГУ им. Ф. Скорины.

Наши студенты имели возможность проходить учебную стажировку в Италии, в университетской клинике г. Модены.

На базе кафедры регулярно организуются международные научно-практические конференции, в которых принимают участие ведущие специалисты в области психологии из Италии, России, Украины, Польши, других стран. Традиционные конференции «Современные подходы к продвижению здоровья», «Чернобыльские чтения-2011», «Психология духовного измерения» проводятся в тесном сотрудничестве с Гомельским медуниверситетом.

Преподаватели и студенты являются инициаторами и организаторами различных психологических мероприятий просветительской направленности, которые проводятся в г. Гомеле и области. Ежегодными стали неделя психологического здоровья для педагогов, учащихся и родителей.

> **Виктория ИГНАТКЕВИЧ, психолог детского оздоровительного центра «Живица», выпускница 2006 года:** ***«Кафедра всегда с интересом поддерживала мою активность в научно-практической деятельности, способствовала моему всестороннему развитию. Было очень полезно понять, что, только делая ошибки, я могу чему-то действительно научиться. Я получила ответы на свои вопросы, познакомилась с интереснейшими людьми, многие из которых пришли в мою жизнь благодаря кафедре».***

Студенческая научно-исследовательская лаборатория «Альянс», организованная при кафедре, за успехи в НИР дважды становилась лауреатом специального фонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренных учащихся и студентов. Она реализовала и продолжает ряд научно-исследовательских и волонтерских проектов. Практическая деятельность студентов-членов лаборатории осуществляется в тесном сотрудничестве с областным и городским центрами коррекционно-развивающего обучения и реабилитации, отделением дневного пребывания для детей с особенностями психофизического развития «Майский цветок», областной клинической больницей, республиканским научно-практическим центром радиационной медицины и экологии человека, Улуковской вспомогательной школой-интернатом для детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей Гомельского района.

> **Юлия ВОРОНИНА, психолог УВРМ ГГУ, выпускница 2005 года:** ***«Здесь я участвовала во всевозможных проектах и именно здесь познакомилась с любимым психологическим театром и своими лучшими друзьями, с теми, с кем иду в жизни и в профессии по сей день».***

Участие студентов в работе лаборатории дает им возможность расширять профессиональную эрудицию, развивать собственную социально-психологическую активность. Это позволяет достигать успехов в будущей профессиональной деятельности и в жизни в целом.

Мы гордимся своей кафедрой и тем, что сделано ее коллективом. Будем хранить и беречь все то, что она нам дала: общение, профессиональный и личный рост, творческие проекты, незабываемые впечатления, возможность понять, что такое психология и кто же такие эти загадочные психологи.

**Дарья КОРОЛЬ,**
**ассистент кафедры социальной и педагогической психологии,**
**магистрант, выпускница 2004 г.**

Прэзентацыя кнігі

# «МУДРОСТИ ЗАЧАЛО И КОНЕЦЪ...»




**Ці дасканала ведаем мы сваю багатую гісторыю, заснаваную на слаўных еўрапейскіх традыцыях? На жаль, не. Мабыць, таму многія з сучаснікаў і лічаць адзінымі сімваламі Беларусі толькі сялянскія лапці ды саху. Але ж наш народ мае велічныя вытокі, якія зыходзяць з часоў глыбокай старажытнасці, гісторыю, якая поўніцца славутымі імёнамі і стаіць нароўні з мінулым іншых народаў. Яна (о, каб яе ведалі!) дазваляе нам па праву ганарыцца сабой, з'ўляецца тым моцным падмуркам, на якім трывала ўзраджаецца беларуская нацыя.**

З нагоды Дня беларускай пісьменнасці, які адзначаўся ў нашай краіне ў першую нядзелю верасня, думкі пра нацыянальную самасвядомасць і годнасць беларусаў гучалі асабліва злабадзённа. Вобразна і наглядна яны былі падкрэслены падчас прэзентацыі кнігі Івана Прылуцкага "Мудрости зачало и конецъ», якая адбылася 2 верасня ў Гомельскай Славянскай спецыялізаванай бібліятэцы.

Па прызнанні аўтара драматургічнага твора – д.ф.н., прафесара, загадчыка кафедры беларускай літаратуры нашага ўніверсітэта І.Ф. Штэйнера, гэта чарговая спроба яго пяра (дагэтуль ужо ўбачылі свет п'есы пісьменніка "Аб шкодзе кніг у наш час" і "Сатырычная камедыя з сучаснага жыцця"), прысвечаная славутаму беларускаму першадрукару і асветніку Францыску Скарыне, разлічана, у першую чаргу, на студэнцкую моладзь, свядомых сучаснікаў, бо менавіта на іх ускладзена адказнасць за будучыню нацыі.

На шчасце, маладыя людзі сур'ёзна аднесліся да сюжэта п'есы, як кажуць, прынялі яго блізка да сэрца. Аб гэтым сведчылі выдатныя тэатралізаваныя пастаноўкі па матывах нованароджанага твора, якія студэнты філалагічнага факультэта прадэманстравалі гасцям прэзентацыі.

Сваімі думкамі пра ролю і месца новага твора ў сучасным жыцці падзяліўся яе аўтар І.Ф. Штэйнер.

**– Іван Фёдаравіч, чаму Вы вырашылі напісаць п'есу менавіта на скарынаўскую тэматыку?**

– Як вядома, беларуская культура бярэ свой пачатак у сусветнай культурнай традыцыі, яна выдатная, еўрапейская. І гэтая думка была падкрэслена славутым першадрукаром Ф. Скарынам, які ў свой час сфармуляваў своеасаблівы Кодэкс гонару і паводзін для беларуса. Ён актуальны і сёння, у адпаведнасці з ім і павінны будаваць сваё жыццё нашы сучаснікі. Гэту думку мне хацелася данесці да моладзі, што, спадзяюся, атрымалася. Акрамя таго, у мяне здаўна была задума расказаць маладым людзям пра неўміручага класіка, імем якога названы наш універсітэт, простай і даступнай для іх мовай.

**– У чым заключаецца сюжэт і ідэя драматычнага твора?**

– Сюжэт даволі просты: Ф. Скарына знаходзіцца на раздарожжы, вырашае для сябе, якой справе лепш за ўсё прысвяціць сваё жыццё. На нялёгкае пытанне ўласнага выбару першадрукару дапамагаюць даць адказы яго слаўныя сучаснікі – Парацэльс, Эразм Ратэрдамскі, Марцін Лютар і інш. Яны даюць асветніку карысныя парады – заняцца камерцыяй, купецкай дзейнасцю, бо "навука ніколі не зробіць багатым і незалежным...". Але ж замест шляху заможнага купца Скарына свядома выбірае складаную і няўдзячную дарогу служэння Радзіме, народу. Выдатны астраном і звяздар, ён прадбачыць свой будучы складаны лёс у пакутах і выпрабаваннях, калі давядзецца рызыкаваць жыццём і бадзяцца па чужых землях. Але ж нічога не перашкодзіць асветніку несці свайму народу слова Божае на роднай мове.

– Адсюль вынікае і ідэя драмы – абудзіць гонар у сучаснікаў за сваіх слаўных продкаў, каб духоўныя ідэалы, складзеныя яшчэ ў перыяд Хрыста, былі значнымі і сёння. Гэта п'еса – урок, які вучыць любові да Радзімы, да чалавека, бацькоў, любові да слова.

**– Загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта П.В. Васючэнка ў сваёй прадмове назваў "Мудрости зачало и конецъ..." самабытным творам з пошукавым, эксперыментальным характарам. У чым гэта выражаецца?**

– П'еса арыгінальная ў тым плане, што Скарыну я паказаў не схематычнай гістарычнай асобай, аратарам і трыбунам, а жывым чалавекам са сваімі думкамі і развагамі. Ён, як і кожны з нас, перш, чым прыняць рашэнне, шмат думае, вагаецца, перажывае.

Акрамя таго, у творы я сумясціў адразу некалькі часавых пластоў XVI і XXI стагоддзяў, спалучыў сучасную лексіку, жарганізмы, амерыканізмы са стараславянскімі словамі, шырока выкарыстаў элементы дыдактызму, бурлеску, гратэску, трагедыі, звярнуўся да інтэртэкстуальнасці і г.д.

**– Іван Фёдаравіч, якога творчага лёсу Вы жадаеце сваёй п'есе?**

– Найперш, каб яна была тэатралізавана. Гэту задачу сёння ўсклаў на сябе Гомельскі абласны драматычны тэатр, у хуткім часе чакаем ад яго гэтага творчага эксперыменту.

Пажадана, каб п'есу паставіў і наш студэнцкі тэатр, у такім выпадку яна можа стаць сапраўднай візітоўкай нашага ўніверсітэта.

**Гутарыла С. ХАЗЕЙ.**

***

І.Ф. Штэйнер, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Міжнароднай Акадэміі навук Еўразіі, выявіўся і пісьменнікам-драматургам. На прэзентацыю яго новага твора ў Гомельскую Славянскую спецыялізаваную бібліятэку прыйшлі калегі, сябры і студэнты. Сваё слова ў адрас аўтара п'есы выказаў прарэктар па выхаваўчай рабоце, к.ф.н., дацэнт Сяргей Іванавіч Ханеня. У вечарыне прыняў удзел і старшыня таварыства Кірылы Тураўскага Валерый Сцяпанавіч Сяліцкі, які з задавальненнем даў характарыстыку п'есе, зачытаў яе гумарыстычныя кавалачкі.

Хочацца падрабязней сказаць пра саму п'есу, якая вельмі ўразіла і зацікавіла. Яна не падзяляецца на дзеі, акты, чытаецца суцэльным творам, які мае ўнутраную структуру.

У творы шмат вострых момантаў, выказванняў аўтара, якія выклікаюць усмешку на твары: *"Калі хваробы няма – гэта не так істотна. Была б хвароба, а лякарства мы прыдумаем"*, або *"Адукацыя заўсёды карысна. Неадукаваны чалавек можа абакрасці вагон, а спецыяліст з універсітэцкім дыпломам здольны ўкрасці цэлую чыгунку"*.

*«Дык хто ж ён такі??? Дурань??? Ці святы?!!»* Гэтае пытанне стаіць завяршальнай кропкай п'есы, але адказ на яго шукаецца на працягу ўсяго твора.

**Ала ДАРАШЭНКА,**
**студэнтка 3 курса філфака.**

# СТУДЕНЧЕСКОМУ ТВОРЧЕСТВУ – ЗЕЛЕНЫЙ ЦВЕТ!




**Четвертый раз на ежегодной республиканской выставке современного визуального творчества студентов «АРТ-АКАДЕМИЯ» представляли свои работы молодые таланты нашего университета.**

В этом году экспозиция выставки размещалась в художественной галерее Университета культуры и во Дворце Республики. В работе выставки, которая проходила с 4 мая по 4 июня, приняли участие 29 вузов республики, заявившие более 4 тысяч экспонатов.

По сложившейся традиции, в марте – апреле в университете прошел отборочный тур, на который было заявлено 39 работ из 6 факультетов. Лучшие 16 работ студентов физического, биологического, экономического, геолого-географического, математического факультетов и факультета психологии и педагогики защищали честь университета на республиканской выставке.

По решению экспертной комиссии «АРТ-АКАДЕМИИ» Дипломом Министерства образования и Национального центра художественного творчества детей и молодежи за активное участие в выставке современного визуального творчества студентов высших учебных заведений награжден Гомельский государственный университет им. Ф.Скорины.

Несмотря на большую конкуренцию среди авторов, в 3 номинациях восемь работ наших студентов признаны победителями и лауреатами. Автором лучшей работы в номинации «Эстэтыка сучаснага мастацтва» стала Наталья Лукашова, студентка физического факультета. Работы представителей геолого-географического факультета отмечены в двух номинациях: Евгения Романюк – «Фотаагляд», а Анастасия Коптева – автором лучшей работы в жанре «Фотаінсталяцыя». Лауреатом в номинации «Дызайн і крэатыўная ідэя» стала работа СНИЛ «Флора и растительность» биологического факультета, представленная Екатериной Манешкиной.

Победители и лауреаты отмечены Дипломами Министерства образования и Национального центра художественного творчества детей и молодежи. Авторы работ, участвовавших в республиканской выставке, также отмечены благодарностью ректора.

Управление воспитательной работы с молодежью благодарит деканаты и студентов факультетов геолого-географического, физического, биологического, экономического, математического факультетов, психологии и педагогики, за активное участие и поздравляет лауреатов IV Республиканской выставки «АРТ-АКАДЕМИЯ» под девизом «Зеленый. Изображение времени».

V Республиканская выставка под девизом «Чырвоны. Апантаны поспехам» ждет своих участников и победителей.

**С. МИЛЕХИНА,**
**зам.начальника УВРМ.**

Официально

# СТИПЕНДИИ БУДУТ ПОВЫШЕНЫ

**Размеры стипендий в Беларуси будут привязаны к тарифной ставке первого разряда. Это предусмотрено Указом №398 «О социальной поддержке обучающихся», который 6 сентября подписал Президент Беларуси Александр Лукашенко.**

В соответствии с документом, все виды стипендий устанавливаются в размерах, кратных тарифной ставке первого разряда. Такой подход позволит упростить порядок исчисления стипендий и будет способствовать их оперативному перерасчету. В целях недопущения снижения размеров стипендий, назначенных до вступления в силу указа, предусмотрено их сохранение до очередного изменения тарифной ставки первого разряда.

Указом также повышаются размеры стипендий отдельным категориям обучающихся.

Размер учебной стипендии магистрантам устанавливается на уровне стипендии, назначаемой студентам-отличникам, осваивающим содержание образовательной программы I ступени высшего образования.

Упорядочен перечень лиц, имеющих право на назначение социальной стипендии при освоении содержания образовательной программы подготовки к поступлению в учреждения образования Республики Беларусь. Такое правило предоставлено детям-сиротам, детям, оставшимся без попечения родителей, а также тем, кто приравнен к этой категории.

Аспирантам, которым назначена стипендия Президента Республики Беларусь и которые в пределах установленного срока обучения защитили диссертации, в месяце отчисления из аспирантуры в связи с ее досрочной защитой указанная стипендия будет выплачиваться в трехкратном размере.

Указом также предусмотрено увеличить на 0,4% объем бюджетных средств, направляемых на выплату надбавок за успехи в учебе, общественной и научной работе и оказания материальной помощи обучающимся.

**БЕЛТА.**

Эхо летнего трудового семестра

# РАБОТА СПОРИЛАСЬ



Строительный отряд в составе студентов нашего университета, сформированный профкомом студентов, активно трудился в летний период на одном из крупнейших предприятий республики – Белорусском цементном заводе в г. Костюковичи Могилевской области. Ребята были заняты на строительстве его второй технологической линии. Команда, которая носила название «Строитель БЦЗ», отправилась работать на грандиозную стройку в период с 11 июля по 21 августа. Возглавил ее студент 4 курса факультета психологии и педагогики Артем Стрейзман, а его заместителем стала второкурсница геолого-географического факультета Татьяна Барейша.

Из беседы с командиром отряда мы узнали, что среди строителей были не только новички, но и те, кто уже принимал участие в подобной работе, как, например, сам Артем. По его словам, все ребята, молодые и активные, под управлением опытных и дружелюбных руководителей без трудностей выполняли работу различного характера: были разнорабочими, решали подсобные задачи по уборке строительного мусора, сбору опалубки, работали с отбойным молотком и т.д. Девушки вязали арматуру и занимались гидроизоляцией стен.

В выходные дни большинство студентов отправлялись домой в родной город, но некоторые из них оставались на отдых в предоставленном им общежитии квартирного типа, которое размещалось недалеко от стройки в деревне Селецкое. Там они посещали дискотеку в местном клубе, проводили время на природе.

Молодые люди, побывавшие на летнем строительстве, уверены, что деятельность стройотрядов – это не только хорошая возможность заработать, но и обрести новых друзей, отлично провести время, совмещая летнюю работу с отдыхом. Но главное, стройотряды



дают огромный жизненный опыт, привносят в студенческие годы нотки разнообразия, оставляя о них незабываемые впечатления.

**Н. УКРОЖЕНКО,**
**студентка 5-го курса**
**факультета иностранных языков,**
**член профкома.**

Выставы

# ВЯРТАННЕ ДА ВЫТОКАЎ

**Прыгожыя маладыя дзяўчаты ў яркіх квяцістых сукенках раскладаюць па паліцах саматканыя ільняныя ручнікі і махрыстыя сурвэткі, клапатліва мітусяцца, папраўляючы размешчаныя на сталах старадаўнія сялянскія талеркі і збаны, бачуркі і кошыкі, збіраюцца невялікімі гурткамі, напаўняючы памяшканне вясёлым дзявочым смехам. Яркімі фарбамі зіхацяць сімвалічныя ўзоры на народных касцюмах маладзіц, лагоднымі гукамі льецца іх цудоўны народны спеў… І ўсім, хто апынуўся ў палоне гэтага чароўнага відовішча, здаецца, быццам хуткаплынны час перанёс іх на стагоддзе таму ў простую сялянскую хату, дзе поўным ходам ідзе падрыхтоўка да святкавання значнай падзеі.**



На самой жа справе пазнаёміцца з загадкавым светам народнай творчасці, даведацца пра багатыя традыцыі продкаў, палюбавацца разнаквеццем традыцыйнага нацыянальнага адзення беларусаў мог кожны наведвальнік выдатнай выставы "Рэчыцкі народны касцюм на фоне мастацкай традыцыі Гомельшчыны", якая распачала сваю працу ў першы дзень верасня ў выставачнай зале нашага ўніверсітэта. Больш за сотню цэнных экспанатаў, апавядаючых пра розныя бакі паўсядзённага побыту простага вясковага жыхара, сабралі арганізатары выставы ў багатую экспазіцыю з фондаў Гомельскага Палаца-паркавага ансамбля, Рэчыцкага і Веткаўскага краязнаўчых музеяў, фальклорна-этнаграфічнага гуртка "Вандроўнік", што дзейнічае пры ГДУ.

Разнастайныя ўзоры глінянага посуду, шматлікія прылады працы, элементы фальклорных святаў, сімвалы багатага ўраджаю – сабранае ў снапок спелае калоссе ды шчодры пшанічны каравай, многія іншыя характэрныя прадметы сялянскага ўжытку, прадстаўленыя на выставе, намалявалі рэалістычную разнапланавую карціну жыцця нашых бабуль і дзядуль, карціну, якая для многіх з нас, гарадскіх жыхароў, вядома выключна з падручнікаў па гісторыі Беларусі ды са старых мастацкіх стужак.

*"Дзякуючы нястомнай працы ўдзельнікаў фальклорных экспедыцый, мы сёння маем цудоўную магчымасць на свае вочы пабачыць унікальныя прадметы чалавечага побыту мінулай пары, якія ўвасабляюць сабой цэлую гістарычную эпоху".*

Гэту думку падчас адкрыцця экспазіцыі падкрэсліў прарэктар па навуковай рабоце ўніверсітэта А.М. Дземідзенка. "Наша жыццё вельмі хуткаплыннае, і такіх цэнных экспанатаў, якія з'яўляюцца сапраўднымі сведкамі гісторыі, становіцца ўсё менш. На шчасце, ёсць людзі неабыякавыя да мінулага свайго народа, зацікаўленыя ў яго вывучэнні, якія, не шкадуючы часу, збіраюць народныя скарбы, зберагаюць іх для нашчадкаў, – адзначыў Алег Міхайлавіч. – Дзякуючы нястомнай працы ўдзельнікаў фальклорных экспедыцый, мы сёння маем цудоўную магчымасць на свае вочы пабачыць унікальныя прадметы чалавечага побыту мінулай пары, якія ўвасабляюць сабой цэлую гістарычную эпоху".

Адметнымі каларытнымі фарбамі прадстаўлена яна ў багатых фальклорных традыцыях, народных святах і сімвалічных абрадах "Купалля", "Ваджэння стралы", "Русалля", "Гукання вясны", яе своеасаблівыя рысы – і ў вобразах простых сялян, прадстаўленых на шматлікіх фотаздымках, зробленых намаганнямі Гомельскай маладзёвай краязнаўчай арганізацыі "Талака", уяўленні продкаў пра светаўладкаванне – і ў шматлікіх народных касцюмах, сабраных арганізатарамі мерапрыемства з розных куткоў Гомельшчыны.



"Ствараючы экспазіцыю, мы імкнуліся паказаць, што багаты народны скарб продкаў – гэта не аджытое, не страчанае навек, наадварот, яму наканавана ўбачыць дзень заўтрашні, – адзначыў ідэйны натхняльнік выставы – кіраўнік фальклорна-этнаграфічнага гуртка "Вандроўнік" пяцікурснік філфака Пятро Цалка. – Гэта ідэя падкрэслена і асаблівасцю размяшчэння экспанатаў: народныя касцюмы – не на вешалках! У цудоўныя квяцістыя сукенкі, бялюткія фартухі і яркія хусткі апрануліся маладыя дзяўчаты, якія ўвасабляюць сабой дзень сённяшні".

Каларытная выстава працуе ў выставачнай зале нашага ўніверсітэта да 16 верасня. У аматараў народнай творчасці яшчэ ёсць час на тое, каб палюбавацца яе багатай экспазіцыяй, якая вяртае нас да вытокаў і размывае межы паміж мінулым і будучым.

**С. РАБЦАВА.**
**Фота У. Чысціка.**

20 верасня – Дзень міру

# ВАЙНА Ў ЛЁСЕ МАЁЙ СЯМ'І
## (аповед майго дзядулі)

**Шэсцьдзесят пяць год над нашай краінай свеціць сонейка, не чуваць выбухаў, стрэлаў… А мой родны дзядуля памятае зусім іншае.**

… Калі пачалася вайна, мне было ўсяго дзесяць год. Але, мабыць, на тое і дадзена чалавеку памяць, каб помніць, не забываць… Нас у сям'і было васьмёра: дзядуля, бабуля, мае маці і бацька, я, дзве сястры ды брат Анатоль. Усе ладзілі між сабой, працавалі шмат, дапамагалі адзін аднаму, гулялі ў вольны час, хаця яго было мала, хадзілі ў суніцы, лавілі рыбу ў нашай Неначы (ого-го-го, колькі рыбы было тады, не тое, што цяпер!). А як прыемна пахлі кветкі, што на лузе за Рудняй! Мы, дзеці, часта хадзілі туды, за гару, купацца ў азёрах.

Аднойчы, калі мы прыйшлі з лесу, я ўбачыў тры машыны і незнаёмых мне людзей у ваеннай форме, але не ў такой, якую апраналі чырвонаармейцы, што стаялі на хутары, калі адступала наша армія. Маці хутчэй паклікала нас у хату і загадала сядзець ціха, бо гэта немцы, яны забіваюць. Потым прыехала яшчэ некалькі машын з салдатамі. Нас выгналі з хаты, і немцы самі пасяліліся ў ёй. Я быў старэйшы ў сям'і (з братоў), бо бацьку забралі ў армію. Ён служыў у коннай артылерыі. Ад бацькі доўга не было пісьмаў, а потым прыйшоў трохкутнік, над якім моцна плакала маці. Яна сказала, што бацька загінуў недзе на Браншчыне. А я нібыта чуў яго голас: "Ты старэйшы, сынок, глядзі маці, сясцёр сваіх ды брата".

Мы жылі ў пограбе, бо ў хаце гаспадарылі фашысты. Праўда, нядоўга гэта было, бо фронт пайшоў далей. Але на вёсцы пакінулі старасту і паліцаяў, якія ўсюды адчувалі сябе гаспадарамі. Як хацелася нам, малым, дапамагчы дарослым знішчыць нелюдзяў! Мае два дзядзькі пайшлі ў партызаны, але неўзабаве аднаго вярнулі адтуль і пакінулі ў падполлі. І стаў мой дзядзька Іван Васільевіч Змушко адным з галоўных падпольшчыкаў Калінкавіч, працуючы на чыгунцы. А другі дзядзька – Сцяпан Васільевіч усю вайну быў галоўным ідэолагам партызанскага атрада "Храбрацы".

Яшчэ раз давялося сустрэцца з фашыстамі ў канцы 1943 года, калі яны адступалі. Была зіма, халодная, снежная. У нашай хаце зноў пасяліліся немцы, а маці з намі не дазволілі нават жыць у пограбе, і мы цэлы тыдзень жылі на балоце за Рудняй. Гэта быў самы цяжкі час у нашым жыцці.

А потым 14 студзеня 1944 года былі вызвалены Калінкавічы і мая родная вёска (гэта якраз дзень майго нараджэння). Але, на вялікі жаль, для маёй сям'і вайна яшчэ не скончылася. Асколкам фашысцкай бомбы маці адарвала ногі. Пакуль яе везлі ў Калінкавічы ў шпіталь, яна памерла ад страты крыві. І засталіся мы круглымі сіротамі. Дзякуй Богу, што былі бабуля з дзядулям, сваякі, суседзі, якія не пакінулі нас у бядзе. Неяк выжылі, хаця страшэнна галадалі, ды і жыць не было дзе: бомба трапіла ў хату, і яна згарэла.

Калі мне споўнілася трынаццаць год, я пайшоў працаваць у калгас. Потым была армія, служба на Чарнаморскім флоце. Сустрэў сваё адзінае каханне, шчасліва пражыў са сваёй абранніцай доўгае жыццё. Больш трыццаці год працаваў на заводзе меліярацыйных машын на станцыі Пхоў, жонка – справаводам у калгасе. Мы нарадзілі дваіх дзяцей, твайго дзядзьку Мікалая і тваю маці Наталлю. Цяпер я на пенсіі, але, унучачка, тое, што было, ніколі не забудзецца. І я вельмі не хачу, каб яно калі-небудзь паўтарылася. Няхай заўсёды будзе мір у нашай Беларусі, а я, Аляксандр Мікалаевіч Шыла, зраблю ўсё, што ў маіх яшчэ сілах, каб ніколі больш не плакалі дзеці, не страчвалі сваіх бацькоў, не заставаліся сіротамі.

… Дзядуля змоўк. Я ўбачыла слёзы на яго вачах. І мне самой стала ніякавата. Я пашкадавала, што так і не паспела пазнаёміцца са сваёй прабабуляй Марыяй Сяргееўнай, якая загінула ад рук фашыстаў. А потым падумала, што маё гора не адно, бо такімі сіротамі сталі многія-многія ўнукі ды ўнучкі. Таму я абяцаю табе, дзядуля, што буду добра вучыцца, любіць цябе, маці, брата, усіх добрых людзей, якія змагаюцца за мір ва ўсім свеце.

**Запісала Алена ЗАНКЕВІЧ,**
**студэнтка гр. ГМ-24 гістарычнага факультэта.**

Спорт

# ОТСТОЯЛИ ЧЕСТЬ ВУЗА И СТРАНЫ

**Факультет физической культуры ГГУ всегда славился своими высококвалифицированными спортсменами, их удачными выступлениями на международной арене. Прошедшее лето не стало исключением. В то время как большинство молодых людей отдыхали, нежась на лучистом солнышке, студенты факультета физической культуры отстаивали честь нашего вуза и страны на ответственных спортивных стартах.**

Поздравляем наших победителей, которые, совмещая достойную учебу в университете с тяжелыми физическими тренировками, сумели доказать свое мастерство и завоевали авторитет на соревнованиях международного уровня. Вот их имена.

Студент 3 курса **Эдуард Михан** (легкая атлетика) стал серебряным призером чемпионата Европы среди молодежи (Острава, Чехия), впервые выполнил норматив мастера спорта международного класса.

Второкурсница **Светлана Тулупова** (гребля на каноэ) завоевала золотую медаль в чемпионате Европы (Белград, Сербия) на дистанции 500 м в двойке, стала победителем чемпионата Европы среди молодежи (Загреб, Хорватия), заняла 4-е место на чемпионате мира (Сегед, Венгрия).

Учащийся заочного отделения магистратуры **Дмитрий Войтишкин** (гребля на каноэ) стал победителем чемпионата мира (Сегед, Венгрия) на дистанции 1 км в четверке, завоевал лицензию на Олимпийские игры 2012 года в Лондоне.

**Янина САВУШКИНА (спортивный пресс-центр ГГУ).**

Познай себя

# ПЕРВАЯ ВЕРШИНА



*Первые шаги на вершине.*
*В центре – Наталья Маркова.*
**Фото В. Чистика.**

Кто не знает строки из известной песни Владимира Высоцкого «Лучше гор могут быть только горы…»?! Подтверждаю, проверено. Говорю с уверенностью, так как проверяла на себе.

Этим летом мне посчастливилось побывать в горах, в альпинистском лагере «Алибек» на Северном Кавказе. Да, именно посчастливилось, так как все благоволило моей поездке.

… Я стою на вокзале в компании гомельских альпинистов (ни капли не слукавлю, если скажу, что это замечательные люди); потом больше суток на поезде, часы езды на машине и вот… я ЗДЕСЬ.

Горы… Многие вещи не передать словами. Да и как я могу рассказать о том, какое это эстетическое удовольствие смотреть на них? Это мощь, красота, да что внешний вид, у них даже энергетика особая, она пронизывает тебя насквозь.

Я с нетерпением ждала первого восхождения. Хотелось на себе испытать все стороны альпинизма, понять, что же это в действительности, а не полагаться на возможно ложные представления, созданные в моей голове на большой земле.

В действительности так и было. Первой моей вершине – пик Кап предшествовали 11 часов пешего подхода в гору, переправа через горную реку, лазанье по скалам, подъем в кошках по снегу и леднику. Да, забыла упомянуть, что все это приходилось делать с довольно весомым рюкзаком за плечами. Все трудности преодолимы, если ты идешь, да и это так отрадно преодолевать их, когда ты вроде бы в обыденной жизни совершаешь маленькие победы, и в первую очередь над собой.

Многие спрашивают: « Как же все-таки на вершине, наверное, тебя переполняла буря эмоций?». А знаете, там, наверху, я ничего не испытала. Конечно же, я была довольна, но сильного эмоционального всплеска не ощутила. К моему удивлению, вся палитра красок открылась для меня внизу, когда смотрела на вершину и видила ее недосягаемость, а крутость уступов и острие гребня говорили о нереальности моего поступка.

Первая вершина, она первая навсегда. Потом много еще чего было, о чем можно вспомнить и рассказать: сложности, трудности, прелести. Но это мелочи по сравнению с тем, что я получила взамен. К тому же горы свели меня с прекрасными людьми, чему я очень благодарна, а самое приятное то, что они здесь, рядом. Я надеюсь, мы еще не раз поедем навестить горы. Да, именно навестить, ведь горы нельзя покорить, их можно только любить и уважать.

Горы навсегда в моем сердце, надеюсь, и они оставили в своей памяти что-нибудь обо мне, возможно, это небольшой и поначалу робкий след новичка.

**Наталья МАРКОВА,**
**студентка гр. П-51**
**юридического факультета.**


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад на 5-гадовы тэрмін па кафедрах:**

– беларускай мовы – дацэнта (2);
– беларускай літаратуры – дацэнта;
– тэорыі і практыкі англійскай мовы – выкладчыка;
– матэматычных праблем кіравання – асістэнта (2);
– эканомікі і кіравання – загадчыка кафедры;
– камерцыйнай дзейнасці і інфармацыйных тэхналогій у эканоміцы – старшага выкладчыка (2);
– радыёфізікі і электронікі – старшага выкладчыка;
– агульнай фізікі – асістэнта;
– хіміі – дацэнта;
– фізіялогіі чалавека і жывёлін – дацэнта;
– лесагаспадарчых дысцыплін – дацэнта;
– геалогіі і разведкі карысных выкапняў – старшага выкладчыка;
– спартыўных дысцыплін – старшага выкладчыка.

**Тэрмін падачы заяў – не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

**Заявы накіроўваць на адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.**

**РЭКТАРАТ.**


Летний отдых

# МОРСКИЕ ВПЕЧАТЛЕНИЯ

В пансионатах курортного поселка Железный порт Херсонской области побывали минувшим летом свыше 100 преподавателей и сотрудников университета. Этот адрес любителям отдыха в Украине, на Черном море уже хорошо известен. Маршруты сюда пролегали и в предыдущие годы.

Три выезда членов коллектива ГГУ в июле и августе в этот живописный уголок организовал профком университета, за что ему благодарны отдохнувшие, набравшиеся здоровья и сил преподаватели, сотрудники и их дети.

Ваш досуг

# ПОПЛЫЛИ!..

С середины сентября по май месяц преподаватели и сотрудники университета смогут посещать бассейны в ЧУП "Випра" и БелГУТе по понедельникам и четвергам в 20.30 и в субботние дни в 20.00. Профком оплачивает аренду четырех водных дорожек, и 200 любителям плавания предоставляется возможность проводить свое свободное время с пользой для здоровья.

# ПРИГЛАШАЕТ ФЕСТИВАЛЬ

**С 15 по 18 сентября в г. Гомеле пройдет VI Международный фестиваль хореографического искусства «Сожскі карагод».**

В его рамках будут организованы конкурсные программы в номинациях: «Народно-сценический танец», «Эстрадный танец», «Современная хореография», «Театр танца огня», «Пантомима», «Конкурс балетмейстерских работ». Гомель на несколько дней погрузится в настоящий круговорот ярких, незабываемых событий, концертов, шоу-программ, в том числе цирковых и ледовых представлений. В праздничных мероприятиях примут участие лучшие профессиональные исполнители, коллективы из Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья.

Профкомы нашего университета приобрели для преподавателей, сотрудников и студентов 50 билетов (40 и 10 соответственно) на торжественное открытие фестиваля, которое состоится на стадионе «Центральный 16 сентября в 20.00.

Билеты розданы по факультетам и подразделениям, студенческому активу.

# КРУТИ ПЕДАЛИ!

На встрече студенческого актива с руководством ГГУ, состоявшейся в конце 2010-2011 учебного года, прозвучало предложение об открытии на территории университета велосипедной стоянки. Есть, оказывается, в студенческой среде приверженцы экологически чистого транспорта, отдающие предпочтение езде на своем двухколесном железном друге переполненным в часы пик троллейбусам и автобусам.

Просьба любителей здорового образа жизни услышана. 1 сентября велопарковка, насчитывающая 11 мест, появилась возле главного корпуса, рядом с входом в "Бистро". Так что крутите педали, велосипедисты, кто учится и работает в университете, и оставляйте свои надежные, мобильные транспортные средства на стоянке.

**Фото В. Чистика.**



Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры рускай і сусветнай літаратуры глыбока смуткуюць з выпадку смерці дацэнта **МАЛЯЎКІ Мікалая Аляксандравіча** і выказваюць спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў кафедры эканамічнай тэорыі і сусветнай эканомікі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ДЗМІТРЫЕВАЙ Наталлі Юр'еўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **МУЖА**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю выказваюць глыбокае спачуванне намесніку начальніка ўпраўлення **МІЛЁХІНАЙ Святлане Леанідаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку аддзела аховы працы і ТБ **ПРЫШЧЭПАВУ Сяргею Сцяпанавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў факультэта падрыхтоўкі да паступлення ў вну і навучання замежных студэнтаў выказваюць глыбокае спачуванне сакратару дэканата **КАПКОВАЙ Таццяне Сяргееўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **БАЦЬКІ**.

Калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта замежных моў глыбока смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці студэнткі 5 курса **СТРЭЛЬСКАЙ Яўгеніі Генадзьеўны** і выказваюць глыбокае спачуванне яе родным і блізкім.

Калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў геолага-геаграфічнага факультэта глыбока смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці студэнта 5 курса **ХОРАШАВА Дзяніса Аляксандравіча** і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў юрыдычнага факультэта глыбока смуткуюць з прычыны трагічнай гібелі студэнта 5 курса **БАРАЎЦОВА Васіля Васільевіча** і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.



ЗАСНАВАЛЬНІК —
УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны».



Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл.: 60-30-71.
E-mail: rggu@gsu.by



Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г.
Рэгістрацыйны № 263.
**РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК**

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на ОАО «Полеспечать», г.Гомель, ул.Советская,1.
Ответственность за качество печати несет ОАО «Полеспечать».
Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4270
Падпісана да друку
13 верасня ў 10.00.

ISSN 2077- 1053